

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №4
Снежань 2019

# З надыходзячым Новым годам і Калядамі!




Шчыра віншуем усіх настаўнікаў, вучняў і бацькоў з надыходзячым Новым Годам і Калядамі!

Няхай у Новым 2020 годзе здзейсняцца мары, а ваша жыццё будзе напоўнена толькі цудоўнымі момантамі і падзеямі.

Мы жадаем вам здзяйснення задуманага, шчасця, радасці, здароўя і аптымізму!







## З Новым 2020 годам і Калядамі!

# Баль-маскарад “Навогодні карнавал”

27 снежня ва ўстанове прайшоў баль-маскарад “Навагодні карнавал” для выхаванцаў дзіцячага садка і вучняў 1-9 класаў.

Разам з казачнымі персанажамі дзеці вадзілі карагод, а з галоўнымі героямі свята – Дзедам Марозам і Снягурачкай - запальвалі агні на навагодняй елачцы, спявалі песні, танцавалі, прымалі актыўны ўдзел у навагодніх гульнях.





За паспяховую вучобу і актыўны ўдзел у грамадскай дзейнасці і школьным жыцці Казаран Канстанцін (вучань 5 класа) і Сцябуля Дзмітрый (вучань 6 класа) сталі ўдзельнікамі раённага навагодняга дабрачыннага мерапрыемства.






# Новыя правілы ўнутранага распарадку

Ва ўстанове адукацыі пачалі дзейнічаць новыя правілы ўнутранага распарадку, з якімі падчас інфармацыйных і класных гадзін былі азнаёмлены ўсе вучні. Згодна новай рэдакцыі правіл асаблівая ўвага надаецца правілам карыстання мабільнымі тэлефонамі ва ўстанове і належнаму знешняму выгляду навучэнцаў.

З дадзенымі правіламі таксама былі азнаёмлены і бацькі вучняў падчас агульнашкольнага бацькоўскага сходу, дзе прысутнічалі памочнік пракурора Дзяржынскага раёна Туравец І.С., прадстаўнік інспекцыі па справах непаўналетніх Дзяржынскага РАУС Сабалеўская Т.У., якія азнаёмілі законных прадстаўнікоў непаўналетніх з адказнасцю за неналежнае выкананне бацькоўскіх абавязкаў, у чарговы раз звярнулі ўвагу прысутных на адказнасць непаўналетніх за прапарушэнні і злачынствы. На мерапрыемстве прысутнічаў і медыцынскі работнік – Кужоўнік Таццяна Васільеўна.











# Шосты школьны дзень

9 снежня вучні 2-9 класаў наведалі школьны музей, які размешчаны на базе дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №4 г.Дзяржынска”. Падчас эксурсіі навучэнцы пачулі шмат цікавых гістарычных фактаў пра гарады-героі.













# Вітаем цябе, “Блакітны”!

У здаровым целе – здаровы дух!





Рэдкалегія: вучні 8 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 8 класа.